■ Незвычайная глыбінка

# Дом без падмурка, печ — на драўляным фундаменце

## Як жылі беларусы-сакуны на Старадарожчыне

**Толькі ў Старадарожскім раённым гісторыка-этнаграфічным музеі можна ўбачыць сапраўдную беларускую карчму, транспартныя сродкі, якімі карысталіся нашы продкі, азнаёміцца з бытам і традыцыямі так званых беларусаў-сакуноў.**

### «ЗАГУЛЯЦЬ» У «ПЕКЛЕ»

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ў выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай пачалося актыўнае будаўніцтва дарог і паштовых станцый. У другой палове XVIII стагоддзя ўзнікла некалькі буйных магістраляў. Адна з іх — Маскоўска-Варшаўская — прайшла цераз Магілёўскую, Мінскую і Гродзенскую губерні. З гэтага часу паштова-пасажырскі і грузавы рух паміж населенымі пунктамі стаў рэгулярным. Закрануў ён і мястэчка Старыя Дарогі, якое знаходзілася паміж Слуцкам і Бабруйскам.


Беларусы-сакуны ў традыцыйных строях.

На стварэнне экспазіцыі «Гісторыя дарог і паштовай службы» музей атрымаў грант Мінаблвыканкама «У падтрымку больш значных праектаў у галіне культуры і мастацтва». Па замысле аўтараў канцэпцыі ў адной з залаў наведвальнікаў сустракае паштмайстар. А верставыя слупы ўказваюць адлегласць ад Старых Дарог да Масквы і Варшавы. Упершыню ў Расіі яны былі пастаўлены ў 1784 годзе ад Масквы да Каломны. Адсюль і назва «каломенская вярста», якая была прынятая за расійскую меру даўжыні на ўсіх дарогах імперыі і раўнялася 1 кіламетр 60 метраў.

У пачатку XX стагоддзя для пасажырскага і паштовага руху выкарыстоўвалі брычку і дыліжанс, зімой — сані. Цяжкія грузы перавозілі так званымі балаголамі. Цэнтральнае месца ў экспазіцыі займае брычка, якой аддавалі перавагу заможныя сяляне і знаць. Паштовая станцыя ў тыя часы ўяўляла сабой цэлы комплекс пабудоў. Станцыйны дом для сарціроўкі карэспандэнцыі, пакоі для пастаяльцаў, флігель для ямшчыкоў, стайні, карчма, кузня.

Карчмар быў, як правіла, чалавек стрыманы, спакойны, цвярозы і паслужлівы. Ён павінен быў не толькі добра накарміць кліентаў, але і супакоіць дэбашыраў, тых, хто перабраў лішку. Корчмы мелі мудрагелістыя назвы: «Апошні грош», «Пекла», «Пад дубам». Карчма, якая створана ў музеі, называецца «Лавігрош». Тут наведвальнікі могуць азнаёміцца з рэцэптамі традыцыйных блюд мясцовай кухні, з тым, як працавала карчма пачатку XX стагоддзя. Усе яе элементы набліжаны да арыгінала.

Пры паштовай станцыі была кузня, дзе можна было падкаваць каня, замяніць зламанае кола, змазаць дзёгцем восі, адрамантаваць збрую. У імправізаванай кузні ўстаноўлены горн, кавальскія мяхі, кавадла, калекцыі кавальскіх клешчаў і падкоў, малаткі, прадметы ручной коўкі.

Дарэчы, сёння ў Беларусі захавалася 37 паштовых станцый, дзве з іх — у Старадарожскім раёне.

### ОЙ, НАПІЛАСА, НАЕЛАСА ДЫЙ ПАВАЛІЛАСА

Год таму ў музеі створана экспазіцыя «Матэрыяльная і духоўная культура беларуса-сакуна пачатку XX стагоддзя», якая аднавіла быт самабытнай абшчыны гэтай этнічнай групы.

— Экспазіцыю мы зрабілі абапіраючыся на навуковую работу вучонага-этнографа Ісака Сербава, які некаторы час жыў у нашым раёне, а менавіта ў вёсцы Ляўкі. Тут Сербаў здымаў домік у местачкоўцаў. І менавіта ён назваў іх сакунамі з-за манеры вымаўлення: «наеласа», «напіласа» ды «павалілася», — расказала **навуковы супрацоўнік, экскурсавод Кацярына СІДАРОК**. — Яшчэ жанчыны выдзяляліся сярод іншых беларусак сваім адзеннем: насілі традыцыйны галаўны ўбор, які называецца намітка. Ён уяўляе сабой ручнік, даўжыня якога даходзіла да трох метраў. Кожная дзяўчына ткала яго сабе ў пасаг. І калі выходзіла замуж, на галаву ёй павязвалі такі ручнік. Ён уяўляў сабой як бы карону, а адзін канец, які спадаў уніз, сімвалізаваў сабой касу. Падворак беларуса-сакуна таксама адрозніваўся ад падворка звычайнага беларуса. Дваровую забудову адкрываў дом, за ім вузкім калідорам ішлі гаспадарчыя пабудовы: сені, гумно, адрына, хлеў. Дом быў вялікі, моцны, з гонтавым дахам і трыма маленькімі вокнамі: два выходзілі ў двор, адно на вуліцу. Гэта сведчыла пра тое, што сакуны вельмі верылі ў забабоны і лічылі: праз чацвёртае акно, якое мусіць размяшчацца перад спальным месцам, нядобразычліўцы могуць забраць у іх жыццёвыя сілы і энергію.

Акрамя таго, дом сакуна не меў фундамента, стаяў на зямлі або на невялікіх камянях. А вось печ ладкавалася на драўляны падмурак — абпечча. Зімой там трымалі парасят, цялят.

Такія дамы да нашага часу захаваліся ў вёсках Залужжа, Дражна, Ляўкі, Шчыткавічы. Тут можна стварыць музей пад адкрытым небам. Такія задумы ў раёне ёсць.

### САМАГОН ЯК ЧАСЦІНКА ФАЛЬКЛОРУ

— Ці гналі самагон сакуны? — пацікавілася ў экскурсавода.

— У кожным сяле, у кожнай сям'і былі свае рэцэпты прыгатавання алкагольных напояў. Але яны трымаліся ў строгім сакрэце, — падкрэсліла мая суразмоўніца, — перадаваліся з пакалення ў пакаленне па мужчынскай лініі — ад бацькі да сына.

У музеі створана дэгустацыйная зала, дзе экспануюцца аналагі апаратаў для вырабу алкагольнага напою, ёмістасці, куды яго разлівалі. Супрацоўнікам музея ўдалося запісаць толькі адзін рэцэпт прыгатавання самагону, які датуецца пачаткам XX стагоддзя, а менавіта 1908 годам. «Нам яго перадаў мужчына, можна сказаць, не дужа ахвотна. Яго прабабуля запісвала рэцэпты ў таўшчэзную кнігу, якую хавала далей ад чужых вачэй. Наогул, усе спосабы прыгатавання напояў былі па-свойму добрыя, — кажа Кацярына Сідарок.

Нават за мяжой старадарожская самагонка карыстаецца попытам: якасная, чыстая, як сляза. Гэта, можна сказаць, ужо брэнд раёна. Але, як сцвярджаюць спецыялісты, стварыць нейкі магутны праект, як у Дудутках, задумы пакуль няма. Мэта экспазіцыі — паказаць, чым карысталіся жыхары Старадарожчыны, якія настойкі, наліўкі рабілі. У час Вялікай Айчыннай вайны, напрыклад, у партызанскіх атрадах не было медыцынскага спірту. Для апрацоўкі ран падчас аперацый у палявых умовах карысталіся вадкасцямі, якія ўтрымлівалі алкаголь. «Гэтую часцінку нашага мінулага мы павінны захаваць для нашчадкаў. Сёння мы разглядаем яе як маленькі кірунак народнага фальклору», — канстатуе экскурсавод.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*


Так выглядала хата сакуноў.

## Суботнік з Вожыкам

Нічыпар ШЭРАНЬКІ

### КРАПІВА І БАРШЧЭЎНІК

*Байка*

Баршчэўнік каля плота раскашуе
Ды хваліцца зялёнаю кашуляй.
Ківае парасонам-галавой,
Даводзіць Крапіве: «Я родзіч твой!
Такі ж пякучы, злосны, як і ты...»
А тая: «Не мялі, кумок, лухты!
Калі і джгнула я якога госця,
Дык гэта, выбачайце, не са злосці,
А з мэтай выхаваўчаю, каб ён
Не краў з грады чужое працы плён.
Твой жа агонь каго як апячэ,
Той тыдзень ледзьве ногі валачэ.
Падоўгу ўсе яшчэ — малы, стары —
Шкрабуць пасля пачэсы пухіры.
Не суньця лепей да мяне ў радню,
Я і сама сябе абараню!»

* * *

Саюзнікі бываюць і такія,
Што гнаць бы іх далей
сукастым кіем.



Малюнак Кацярыны БАЛЬЦЭВІЧ і Андрэя СІДАРЭЙКІ.

### МІМАХОДЗЬ

Браканьер такі блізкі да прыроды, што далей няма куды.

**Чалавек робіць усё, каб рэдкія жывёлы і расліны сустракаліся яшчэ радзей.**

Калі ваўкі сытыя, авечкі павінны сыходзіць, пакуль цэлыя.

**Пад Новы год высеклі столькі елак, што ажно мароз па скуры прабягае.**

Жабы прынеслі навуцы больш карысці, чым царэўны.

**Віктар ЖЫБРЫК,**
*г. Дзяржынск.*

Уладзімір ГРЫШЧАНКА

### ВАРОНА І ЗАЯЦ

*Байка*

У лесе на старой яліне
Варона ад будзённых спраў
Адпачывала на галіне,
А побач Заяц прабягаў.
Заўважыў птушку косым вокам,
Спыніўся побач з ёй якраз,
Спытаў:
— Што робіш тут, сяброўка?
— Нічога! — быў такі адказ.
— А я ў турботах ледзь не гіну...
Дай, можа, стомленасць здыму,
Без справы сяду пад ялінай.
— Вядома! — каркнула яму.
Пад дрэвам Заяц размясціўся,
Прыжмурыў вочы, разамлеў...
Аднекуль раптам Воўк з'явіўся,
Схапіў нябогу ды і з'еў.
Варона доўга гаравала.
— Чаму ж я Зайцу не сказала:
Без справы можа той сядзець
спакойна,
Хто сеў высока і схаваўся ў лапах
хвойных?!

* * *

Варон дурнымі часта называюць,
Ды часам яны штосьці трапна прыкмячаюць.

### МУДРАСЦЬ

Вытокі мудрасці у вопыце
ляжаць.
Ды вопыт той нялёгка здабываем,
Бо дрэнную адну прывычку маем:
Па сто разоў на граблі наступаць.

### «ПРЫГАЖУНУ»

Калі без ясных для таго прычын
Ты ловіш позіркі цікаўныя жанчын,
Звышабаяльнасцю сваёй не ганарыся:
Правер адзенне лепш і зашпіліся.

### ДАПАМОГА ЦІ ПЕРАШКОДА?

У гісторыі нярэдка так бывала:
Жанчына нас на подзвігі натхняла.
Ды часам (не магу я не сказаць)
Яна ж перашкаджае іх здзяйсняць.
*г. Гомель.*



Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА і Аляксандра БАГДАНОВІЧА.

## ВЯСЕННІ ЭЦЮД

*Пародыя*

*...О, вясна! Як я баюся цябе!..*
**Анатоль ЗЭКАЎ**

Сонечны вясновы дзень, у мяне вельмі добры настрой. Нягледзячы на паважны ўзрост, крочыцца лёгка, акрылена.

О, вясна! Што ты робіш са мной?

Раптам чую за спінай таямнічае і хвалюючае пастукванне жаночых абцасаў: цок-цок-цок... Мая крыху прыгорбленая спіна міжволі выпростваецца, стомленыя ногі набываюць пругкасць. О, гэтае меладычнае пастукванне абцасаў, рытм якіх дзіўным чынам супадае з арытміяй майго сэрца! Можа, азірнуцца? Не! Баюся сваім выглядам спалохаць таямнічую спадарожніцу.

О, вясна! Як жа я цябе чакаў!

А абцасікі за спінай працягваюць спакусліва і прываблива пацокваць. А што, калі яна ідзе менавіта за мной і чакае маёй мужчынскай рашучасці? Трэба азірнуцца, няма больш моцы стрымліваць сябе. Яшчэ крок — і пагляджу на яе.

І ўсё ж не, вунь і мой завулак. Калі яна паверне за мной, рызыкну і пакажу, на што я яшчэ здольны!

О, вясна! Як я баюся цябе!

Нарэшце я павярнуў да свайго дома. Сэрца так моцна тарабаніць, ажно стуку абцасаў не чуваць. Няўжо яна прайшла прама?

Не, усё ж такі чую жаданае «цок-цок» і нават адчуваю патыліцай яе гарачае дыханне. Толькі б не было ў двары маёй жонкі, а то сапсуе гэтую вясновую казку.

Дзякуй богу, каля майго дома нікога няма, і я рашуча, па-мужчынску, азіраюся і... слупянею.

Цок-цок... Мяне абмінула старая бабулька, якая жыве па суседстве, і пайшла па сваіх справах.

О, вясна! Што ты робіш са мной?

**Сяргей ДАВІДОВІЧ,** *г. Мінск.*